**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2018 г.

## <u>Мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Дзяржаўнага сцяга РБ</u>

**9 мая**

Бібліятэка сумесна з Домам культуры правяла ўрачыстае шэсце Несмяротнага палка па вуліцах аграгарадка Лука. Каля мемарыяльнага комплексу жыхарам, загінуўшым у гады вайны, ўдзельнікі шэсця ўшанавалі памяць хвілінай маўчання і ўсклалі кветкі да помніка. Завяршылася мерапрыемства святочным канцэртам, які адбыўся ў актавай зале Дома культуры.

Лукская ПБ, 90 чал.

**10 мая**

У бібліятэцы прайшоў урок памяці “Время уходит, с нами остаётся память” для навучэнцаў Батчанскай школы. Дзеці праслухалі агляд кніжных выданняў з фонду бібліятэкі пра вайну, прачыталі вершы, пазнаёміліся з кніжнай выставай “Мы помним их имена”, з кампазіцыяй “Дорога памяти”, фотавыставай “Спасибо деду за Победу!”. Вялікую цікавасць у прысутных выклікала відэапрэзентацыя “Журавлики”.

Батчанская ПБ, 29 чал

**16 мая**

У рамках акцыі “Прочти книгу о войне” бібліятэка правяла інфаўрок “Читаем детям о войне” для навучэнцаў мясцовай школы. З аповесці Сяргея Аляксеева “Брэсцкая крэпасць” прысутныя пазналі пра біяграфію пісьменніка, прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні подзвігу абаронцаў крэпасці. Дзеці прагледзелі прэзентацыю “Я - помню. Я – горжусь” і матэрыялы выставы з мастацкімі творамі пра вайну, фатаграфіямі і медалямі ветэранаў. Пад канец мерапрыемства ўсе ўдзельнікі выбралі кнігі пра вайну.

Кіселявецкая ПБ, 23 чал.

**21 мая**

Для Ўдзельнікаў аматарскага клуба “Залатыя гады” прайшоў літаратурна-музычны вечар “Песни великого Подвига”. Вядучыя сустрэчы расказалі пра гісторыю стварэння песень Вялікай Айчыннай вайны “Священная война”, “В землянке”, “Алеша”, “Синий платочек”, “Темная ночь”, “Катюша” і інш. Прыемным сюрпрызам для гасцей стала канцэртная праграма, падрыхтаваная салістамі калектыва мастацкай самадзейнасці Верхалесскага Дома культуры і вакальнай групы Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыяй “Песни, пришедшие с войной”.

ЦРБ, 38 чал.

## <u>Мерапрыемствы да Дня сям'і</u>

**15 мая**

Супрацоўнікі бібліятэкі правялі для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа пазнавальную гадзіну "Семья – любви великой царство". Вядучыя расказалі пра гісторыю свята, пра святых заступнікаў сям'і. Пра рэпрадуктыўнае здароўе расказала ўрач-гінеколаг Кобрынскай ЦРБ Церабей В.І. Напрыканцы мерапрыемства прысутныя прынялі актыўны ўдзел у віктарынах, конкурсах, успомнілі прыказкі, прысвечаныя дому, сям'і.

ЦРБ, 35 чал.

**16 мая**

У час правядзення свята сям'і "Счастливы вместе" самыя ганаровыя сем'і в.Навасёлкі і іх аднавяскоўцы разглядалі фотакалаж "Венец всех ценностей семья" з сямейнымі фатаграфіямі, глядзелі музычныя нумары мастацкай самадзейнасці Дома культуры, апладыравалі выступленню танцавальнага аб'яднання "Капрыз" мясцовай школы. Запрошаныя сем'і бралі ўдзел у разнастайных конкурсах і віктарынах. Усіх прысутных са святам павіншаваў самы актыўны чытач бібліятэкі, старшыня савета ветэранаў працы Таццяна Данілаўна Буйніч. Ганаровым сем'ям уручылі дыпломы і падарункі.

Навасёлкаўская ПБ, 75 чал.

**23 мая**

Літаратурна-паэтычная група бібліятэкі прыняла ўдзел у правядзенні свята "Моей семьи счастливые моменты", якое праводзілася ў Залескім ЦКД у рамках раённага семінара старшыняў і кіраўнікоў спраў сельвыканкамаў Кобрынскага раёна. Прысутныя пазнаёміліся з лепшымі чытацкімі сем'ямі, якія сёлета адзначаюць юбілеі сумеснага жыцця.

Пра кожную сям'ю падрыхтаваны відэаролік і выстава іх творчых прац. Запрошаныя сем'і падзяліліся сакрэтамі шчаслівага і працяглага сямейнага жыцця. Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава "Семью сплотить сумеет мудрость книг".

Залеская ПБ, 100 чал.

**22 мая**

Бібліятэка правяла літаратурна-музычную гадзіну "Дом моей мечты", гасцямі якой сталі ўдзельнікі клуба сямейнага чытання. Дзеці і іх бацькі даведаліся аб гісторыі свята, традыцыях, сямейных каштоўнасцях. Прысутныя прынялі актыўны ўдзел у гульнях, віктарынах, чыталі вершы, дапаўнялі пасловіцы і пагаворкі аб сям'і, адгадвалі загадкі. Дапаўненнем да мерапрыемства сталі відэакліпы аб сям'і і выступленне дзяцей з вершамі і песнямі.

Шамятоўская ПБ, 23 чал.

## **Мерапрыемствы ў рамках акцыі “Мой стиль – жить без табака!”**

**13 мая**

У бібліятэцы адбылося выступленне літаратурна-паэтычнай групы “Здоровое поколение – богатство страны”. Вядучыя расказалі дзецям аб самым небяспечным рэчыве ў тытуні, аб тытунёвым дзёгці і пра патрэбу фарміравання адмоўнага стаўлення да тытунекурэнню. Прысутныя прагледзелі відэафільм “Паляванне за розумам”. Завяршылася мерапрыемства аглядам кніжнай выставы “Не акажыся ў палоне тытунёвага дыму”.

Буховіцкая ПБ, 23 чал.

**28 мая**

У рамках акцыі “Беларусь без табака” прайшоў прафілактычны ўрок “Не дари свою жизнь сигарете”. Бібліятэкар расказала дзецям пра згубны ўплыў нікатыну на фізічнае і псіхалагічнае здароўе чалавека, пра маркетынгавыя прыёмы, накіраваныя на павелічэнне продажу цыгарэт і пра барацьбу з курэннем на тэрыторыі рэспублікі. Разыгрываліся жыццёвыя сітуацыі, як супрацьстаяць прапановам запаліць.

Гарадзецкі філіял, 18 чал.

**31 мая**

У час правядзення інфармацыйнай гадзіны “Брось сигарету” дзеці зрабілі невялікі экскурс у гісторыю тытуню “З чаго ўсё пачыналася”, праслухалі міні-лекцыю “В рабстве вредных привычек”, адказалі на пытанні вядучай мерапрыемства. Для ўдзельнікаў мерапрыемства падрыхтаваны буклеты аб шкодзе курэння.

Шамятоўская ПБ, 35 чал.

**31 мая**

Для навучэнцаў Лукскай СШ адбылася інфармацыйная гадзіна “Курыць не модна, модна быць здаровым”. Прысутныя праслухалі інфармацыю пра сітуацыю па Брэсцкай вобласці ў фактах і лічбах, пра шкодны ўплыў тытуню і спайсаў на арганізм, адказалі на пытанні тэматычнай віктарыны, прагледзелі відэапрэзентацыю “Курение или здоровье – всё в ваших руках!”. Усім дзецям бібліятэкар раздала буклеты “Аб шкодзе курэння”.

Лукская ПБ, 27 чал.

## **Іншыя мерапрыемствы**

**4 мая**

У рамках Года малой радзімы бібліятэкар для сваіх маленькіх чытачоў правяла пазнавальна-гульнявую праграму “Лепей пазнай свой родны край”. Дзеці гулялі ў гульні, адказвалі на пытанні віктарыны “Знаўца роднай прыроды”, адгадвалі беларускія загадкі, даведаліся аб паходжанні назвы сваёй вёскі.

Балоцкая ПБ, 25 чал.

**11 мая**

Падчас правядзення Дня прафесійнага развіцця для супрацоўнікаў публічных бібліятэк раёна з кансультацыяй "Культура речи библиотекаря в контексте норм литературного языка" выступіла спецыяліст аддзела маркетынгу, пра словы-паразіты, маўленчы этыкет і маўленчае камунікаванне расказалі сельскія бібліятэкары. Відэатрэнінг "От методических рекомендаций – к их внедрению в краеведческую работу библиотек" правяла галоўны бібліёграф.

ЦБ, 57 чал.

**21мая**

У час правядзення віртуальнага падарожжа "Завітаем у музей", прымеркаванага да Міжнароднага дня музеяў, супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі навучэнцаў СШ №1 з незвычайнымі музеямі свету і з незвычайнымі музеямі Беларусі: Музеем карэт, Аптэкай-музеем, Музеем землязнаўства, Музеем ката і іншымі.

ЦБ, 46 чал.

**24 мая**

Яшчэ адзін праект пачынае сваю рэалізацыю ў бібліятэцы - Размоўны клуб англійскай мовы (English Speaking Club). Гутарковай практыкай англійскай мовы на базе інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра пачалі займацца больш за сорак чалавек рознага ўзросту. Тэмай чарговага пасяджэння сталі падарожжы. Заданні вядучых, пабудаваныя ў гульнявой форме: «World's Map», «Who am I», «Plan Your Holiday» дазволілі ўдзельнікам распавесці адзін аднаму пра свой вопыт і ўражанні і нават спланаваць бліжэйшы адпачынак пры мінімальных выдатках.

ЦБ, 46 чал.

**27 мая**

Праваслаўнае свята Тройцу ў бібліятэцы сустракалі ў літаратурнай святліцы "На Святую Тройцу няхай сэрца адкрыюцца" з вершамі, песнямі, гульнямі і карагодамі. Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных з біблейскай легендай аб найсвяцейшай Троіцы, з тым, як святкавалі Сёмуху ў даўніну, правялі конкурсы на лепшага знаўцу прымавак пра Тройцу і на лепшае выкананне песні "Во поле берёза стояла". Да свята аформлена кніжная выстава "Троіца - зялёная нядзеля". Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі "В поисках призвания".

Гарадзецкі філіял, 42 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81